# ДЗЕЙНАСЦЬ РЭГІЯНАЛЬНЫХ МУЗЕЯЎ ПА ВЫРАТАВАННІ І ЗАХАВАННІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ УСХОДНЯГА ПАЛЕССЯ Ў ПОСТЧАРНОБЫЛЬСКІ ПЕРЫЯД

**Я. А. Кавалёў,** *магістрант*
*кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасная сацыяльна-культурная сітуацыя ў свеце характарызуецца нарастаннем колькасці экалагічных і тэхнагенных катастроф, ваенных канфліктаў і сацыяльна-эканамічных крызісаў. А найвялікшай тэхнагеннай катастрофай XX ст. лічыцца аварыя на Чарнобыльскай АЭС, якая нанесла значны ўрон не толькі ў сацыяльна-эканамічным, але і ў культурным плане. Вялікая частка тэрыторыі Усходняга Палесся была забруджана радыяцыйнымі элементамі. Культурная спадчына аднаго з самых старажытных гісторыка-культурных рэгіёнаў у выглядзе прадметаў этнаграфіі і твораў народнага мастацтва была пакінута на радыеактыўнай тэрыторыі.

Першыя спробы па ліквідацыі наступстваў гэтай катастрофы на гісторыка-культурную спадчыну былі распачаты асобнымі прадстаўнікамі навукі і культуры ў канцы 1980-х гг. А ў 1991 г. Саветам Міністраў БССР была створана Дзяржаўная гісторыка-культурная экспедыцыя па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры ў раёнах, што пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Гэтая экспедыцыя здзяйсняла каардынацыю ўсёй працы па выратаванні гісторыка-культурнай спадчыны [1]. Як юрыдычны суб’ект экспедыцыя з’яўлялася самастойнай навукова-даследчай і гаспадарчай адзінкай. Фінансаванне яе дзейнасці адбывалася за кошт сродкаў, што накіроўваліся з дзяржаўнага бюджэту на ліквідацыю наступстваў аварыі. Згодна са статусам і зыходзячы з тых сродкаў, якія выдзяляліся рэспублікай на ліквідацыю наступстваў аварыі, ратаваліся ў першую чаргу помнікі, якія маглі быць беззваротна страчаны. Аднак усё ж недастатковае фінансаванне і тэхнічная неабсталяванасць адмоўна адбіліся на рабоце экспедыцыі і раённых музеяў. Фактычна па гэтых прычынах было немагчыма

арганізаваць вываз каштоўнасцей у тым аб’ёме, як планавалася першапачаткова пры арганізацыі экспедыцыі [2].

У сваёй дзейнасці супрацоўнікі экспедыцыі наладжвалі сумесныя выезды ў зону адсялення з Музеем старажытнабеларускай культуры Інстытута этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі і Беларускім дзяржаўным музеем архітэктуры і побыту. На аснове сабраных там прадметаў 26 красавіка 1996 г. у Музеі старажытнабеларускай культуры была створана экспазіцыя «Помнікі этнаграфіі і народнага мастацтва чарнобыльскай зоны»[3]. Між тым, нягледзячы на актыўную працу, у 2001 г. экспедыцыя перастала існаваць па прычыне прыпынення фінансавання.

З гэтага часу значна павышаецца роля раённых музеяў у справе выратавання гісторыка-культурных помнікаў чарнобыльскай зоны: Брагінскага гістарычнага музея з карціннай галерэяй, Ельскага краязнаўчага музея, Нараўлянскага этнаграфічнага музея, Хойніцкага краязнаўчага музея.

Супрацоўнікі *Брагінскага гістарычнага музея з карціннай галерэяй* у размове, якая адбылася 15.08.2010 г. з аўтарам дадзенага артыкула, адзначаюць, што ў 1991–2010 гг. імі праводзіліся асобныя экспедыцыі на тэрыторыю Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Першапачаткова значную дапамогу ў іх арганізацыі аказвалі супрацоўнікі Музея старажытнабеларускай культуры. Экспедыцыі дазволілі сфарміраваць этнаграфічны раздзел экспазіцыі. У музеі створаны фотаархіў з 70-і чорна-белых здымкаў. На гэтых фотаздымках зафіксаваны некаторыя жылыя і гаспадарчыя пабудовы, якія знаходзяцца ў зоне адсялення. Многія фотаздымкі маюць значную гісторыка-этнаграфічную каштоўнасць. У красавіку 2011 г. на іх аснове была адкрыта фотавыстава «Подых Чарнобыля праз 25 гадоў».

У 1991–1992 гг. асобныя экспедыцыі праводзіліся *Ельскім краязнаўчым музеем.* Дзякуючы ім у музеі была сфарміравана этнаграфічная калекцыя. Аднак па прычыне тэхнічнай неабсталяванасці не быў створаны фотаархіў. У 2010 г. супрацоўнікамі музея былі праведзены яшчэ дзве экспедыцыі ў пакінутыя вёскі. [Паводле інтэрв’ю, праведзенага 22.08.2010 г. с супрацоўнікамі Ельскага краязнаўчага музея.]

Экспедыцыі *Хойніцкага краязнаўчага музея* на тэрыторыю Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка з мэтай выратавання гісторыка-культурных помнікаў, як засведчыў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І. М. Маслака, дырэктар Хойніцкага краязнаўчага музея, не праводзіліся, таму адсутнічае і фотаархіў.

За перыяд з 2001 па 2010 г. супрацоўнікамі *Нараўлянскага этнаграфічнага музея* ладзілася каля 12 экспедыцый у зону адсялення. Большасць экспедыцый праводзіліся з 2001 па 2007 г. Аднак з прычыны непрыстасаванасці транспартных сродкаў для перавозкі буйных прадметаў (легкавы аўтамабіль выдзяляўся Нараўлянскім аддзелам культуры) супрацоўнікі музея збіралі ў асноўным прадметы ткацтва і вышыўкі. З 2007 г. экспедыцыі не праводзіліся з-за недахопу сродкаў.

Як паведамляе Р. Б. Бобр (09.11.2011 г.), дырэктар Нараўлянскага этнаграфічнага музея, у музеі створаны фотаархіў, у якім налічваецца больш за 100 чорна-белых фотаздымкаў, зробленых у перыяд з 1970 па 1990 г. Многія з іх былі перададзены на захаванне мясцовымі жыхарамі. Асаблівую ўнікальнасць уяўляюць здымкі, зробленыя да 1986 г., на якіх зафіксаваны жылыя і гаспадарчыя пабудовы, што знаходзяцца зараз у межах Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Некаторыя з іх маюць гістарычную каштоўнасць. З 1990 па 2007 г. фотафіксацыя адселеных вёсак падчас правядзення экспедыцый не праводзілася па прычыне тэхнічнай неабсталяванасці музея.

Такім чынам, можна канстатаваць, што з 1986 па 2011 г. большасць рэгіянальных музеяў, размешчаных у пацярпелых раёнах, хаця і праводзілі работу па выратаванні гісторыка-культурнай спадчыны Усходняга Палесся, аднак недахоп выдзяляемых бюджэтных сродкаў і вынікаючая з гэтага тэхнічная неабсталяванасць з’яўляюцца асноўнай праблемай на шляху да выратавання пакінутай спадчыны.

1. *Філістовіч, М.* А справа зусім не ў рэанімацыі... Што засталося ад дзяржэкспедыцыі?/ М.Філістовіч // Культура. – 2003. – 7 сакавіка.

2. *Філістовіч, М.* Няма падстаў для аптымізму / М. Філістовіч // Культура. – 1994. – № 6. – 8 с.

3. *Чарнобыль.* Погляд праз дзесяцігоддзе: даведнік / пад рэд. Я. В. Малашэвіча. – Мінск: БелЭн, 1996. – 319 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ